# НАЗВЫ ЧАСТАК ЦЕЛА ЧАЛАВЕКА Ў БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ: НАЗВЫ ПАЛЬЦАЎ

**К. М. Муха**
*БДПУ (Мінск)*
*Навук. кіраўн. – Н. П. Лобань, канд. філалаг. навук, дац.*

**Анатацыя.** У артыкуле разглядаюцца назвы пальцаў рук чалавека ў беларускай мове; прыводзяцца лексічныя паралелі з назвамі пальцаў з іншых моў; раскрываецца паходжанне названых адзінак.

**Ключавыя словы:** назвы пальцаў; адзінец; пястук; ківун; даўгай; пярсцец; мезенец.

У кожнага народа ёсць свае адметныя назвы для пэўных прадметаў, для розных прылад, у тым ліку і для частак чалавечага цела. Назвы частак цела чалавека маюць сваю этымалогію, сваю гісторыю ўзнікнення.

У старажытнасці пазнанні чалавека ў анатоміі былі вельмі ўмоўнымі. Таму разуменне фізіялогіі было цесна пераплецена з містычнымі перакананнямі. Асаблівую цікавасць выклікаюць назвы пальцаў. Вядома, што яшчэ ў Старажытным Рыме назвы пальцаў звязваліся з асаблівасцямі іх выкарыстання, з іх функцыямі і з уяўнымі сувязямі з іншымі сістэмамі і органамі цела чалавека.

Разгледзім наступныя беларускія назвы пальцаў рукі чалавека:

- палец *адзінец* або *пястук*, *вялікі*;
- палец *ківун* або *паказальнік*, *указальны*, *паказальны*;
- палец *сярэдні* або *даўгай*;
- палец *пярсцец* або *персцянец*, *безыменны*, *безназоўны*;
- *мезенец*.

Першы – *вялікі* палец. Ён як бы стаіць асобна ад іншых пальцаў. У старажытнаанглійскай мове яго назва азначала "*тоўсты*", і сапраўды, у параўнанні з астатнімі ён самы тоўсты. У іншых еўрапейскіх мовах падкрэсліваецца, што ён з'яўляецца магутным, самым моцным, хоць і самым кароткім. У некаторых народаў ён часта носіць імя галоўных членаў сям'і: "*бацька*", "*дзядуля*" [2]. У народзе гэты палец называюць *пястук*. Відавочна, назва паходзіць ад слова *пяста* (*пястныя косткі*). Магчыма, гэту назву можна звязаць і са словам *пястун*: калі ў сям'і адно дзіця, яго называюць *пестуном*, так і тут, гэты палец стаіць асобна, адзін.

Наступны палец – *ківун*. Людзі часцей называюць яго *ўказальны*, *паказальны*, *паказальнік*, таму што калі нас просяць паказаць дарогу ці пытаюць, дзе што-небудзь знаходзіцца, мы паказваем, указваем гэтым пальцам. Таксама, калі ў нас просяць цішыні або паказваюць сваё незадавальненне, то робяць гэта з дапамогай пальца-*ківуна*. А таксама гэты палец яшчэ называлі і

называюць “*пальцам, які страляе*”, таму што ён выкарыстоўваўся для адцягвання цецівы лука. У іранцаў ён лічыцца пальцам прызывання, праклёну і абароны. У туркаў ён вядомы як “*палец малітвы*” або “*палец сведчання*”, што звязана з яго выкарыстаннем у мусульманскай практыцы [1].

Наступны, трэці, палец – *сярэдні*. Вось яго можна было б называць вялікім, бо ён самы вялікі і доўгі. У беларускіх народных гаворках яго называюць проста *даўгай*. Уражвае разнастайнасць назваў гэтага пальца ў іншых мовах. У цюркскіх мовах яго часта называюць “*сярэдняй таполяй*”, параўноўваючы пальцы з дрэвамі. У індзейцаў ён вядомы як “*сярэдні сын*”. Часта сустракаецца такая назва, як “*доўгі палец*”. Ёсць і больш паэтычныя варыянты: “*высокая трава*”, “*высокі турак*” [1].

Наступны, чацвёрты, палец – *пярсцец*, або *персцянец*. Менавіта на ім прынята насіць заручальны пярсцёнак. Але не ўсе ведаюць, што стаіць менавіта за гэтай традыцыяй. Згодна з даўнімі медыцынскімі ўяўленнямі, ад гэтага пальца да сэрца ішла прамая артэрыя. Менавіта таму муж і жонка пасля заключэння шлюбу носяць на ім пярсцёнак. Палец адыгрываў важную ролю ў медыцынскай практыцы. Лекары часта выкарыстоўвалі яго пры прызначэнні лячэння. Такія функцыі безназоўнага пальца натхнілі на яго назвы: “*палец доктара*”, “*палец, які лечыць*”, “*сардэчны палец*”, “*піявачны палец*” [2]. Апошняя назва з’явілася ў сувязі з тым, што на яго часта ў медыцынскіх мэтах насаджвалі піявак. Гэты ж палец і *безназоўны*, таму што сам па сабе ён ніякай функцыі не выконвае. Найбольш актыўна ён праяўляе сябе, напэўна, падчас ігры на музычных інструментах, а таксама пры наборы тэксту на клавіятуры.

Апошні, пяты, палец – гэта *мезенец*. *Мезенец* – (ад стараж.-рус. “мѣзиный”) – пяты, самы малы, маленькі, малодшы [3]. У турэцкай мове мезенец вядомы як “*вераб’іны палец*”. У Індыі яго называюць “*пальцам Буды*”, а рымляне звалі “*пальцам Меркурыя*”. Дзякуючы таму, што ён крыху адстае ў росце ад астатніх пальцаў, у некаторых мясцовасцях яго называюць “*сіратой*” [1]. Функцый у гэтага пальца зусім не шмат: хіба што ігра на музычных інструментах, набор тэксту на клавіятуры і некаторыя іншыя (“*вушны палец*”).

У кожнага народа, у кожнай мове паходжанне назваў пальцаў рукі цесна звязана з тымі прадметамі і з’явамі, з якімі яны асацыююцца: у адных – гэта жывёлы, у другіх – дрэвы, расліны, нейкія асобныя рэчы. У беларускай мове ў аснову назваў пальцаў рукі ляглі пераважна іх знешнія характарыстыкі або функцыянальнае прызначэнне. Як бачым, нават такія назвы частак цела чалавека, як пальцы, з’яўляюцца непаўторным і запамінальным культурным кодам кожнага народа, у тым ліку і беларускага.

## Літаратура


1. Иванова, О. Названия пальцев: интересные факты [Электронный ресурс] / О. Иванова // Syl.ru – Режим доступа: https://www.syl.ru/article/335301/nazvaniya-paltsev-interesnyie-faktyi. – Дата доступа: 12.05.2020.
2. Романютенко, П. Откуда появились названия пальцев [Электронный ресурс] / П. Романютенко // Travelask.ru журнал.– Режим доступа: https://travelask.ru/blog/-posts/20532-otkuda-vzyalis-nazvaniya-paltsev. – Дата доступа: 12.05.2020.
3. Skarnik: моўны скарб [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://www.skar-nik.by/tsbm/38164. – Дата доступу: 12.05.2020.